Источник: "Краязнаўчая газета" - 2015-06-11

*Наш каляндар*

# З пакалення расстралянай літаратуры

**Леапольд РОДЗЕВІЧ** нарадзіўся 12 чэрвеня 1895 г. у фальварку Кур'янаўшчына ў Вілейскім павеце (цяпер Лагойскі раён) у збяднелай шляхецкай сям'і. Скончыў Вілейскае гарадское вучылішча, у дзевятнаццаць гадоў пераехаў да сястры ў Вільню. У той жа час пачаў удзельнічаць у Беларускім музычна-драматычным гуртку, разам з братам Чэславам і сястрой Ядвігай у складзе трупы Ігната Буйніцкага выступаў у тэатральных пастаноўках.


1923 г.

У Першай сусветнай вайне Л. Родзевіч не ўдзельнічаў з-за стану здароўя, у 1915 г. выехаў на Паўночны Каўказ да сястры Яніны. Пасля лютаўскай рэвалюцыі быў мабілізаваны ў войска, адкуль неўзабаве ўцёк і накіраваўся ў акупаваны немцамі Мінск. Працаваў пісарам у Беларускай вайсковай камісіі і службоўцам у міністэрстве сельскай гаспадаркі, а калі ў Мінску ўсталявалася савецкая ўлада, вярнуўся ў родныя мясціны і быў настаўнікам у мясцовай сямігодцы. Пасля прыходу польскіх войскаў перабраўся ў Вільню.

Л. Родзевіч быў рэдактарам газетаў «Наша будучыня», «Беларускі звон», выдаваў творы беларускіх пісьменнікаў: дзякуючы яго клопатам пабачылі свет «Строма» Уладзіміра Дубоўкі, «Уяўленне» і «На ростані» Уладзіміра Жылкі. У 1920-х – 1930-х гг. – рэдактар газеты «Чырвоны сцяг» і часопіса «Бальшавік», член камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі пры АН БССР, ад якой быў адхілены ў пачатку 1933 г. 18 ліпеня таго ж года Л. Родзевіча арыштавалі і выслалі за межы Беларусі, у Саратаў, на жыццё зарабляў працай у лясніцтве. У 1938 г. зноў быў арыштаваны, далейшы лёс невядомы – магчыма, яго расстралялі. Быў рэабілітаваны ў 1956 г.

Л. Родзевіч вядомы як празаік, аўтар п'есаў «Блуднікі», «Пакрыўджаныя», «Збянтэжаны Саўка», «Пасланец», «Багаты і бедны», «Досвіткі», «Кавалі», таксама пісаў вершы. Адзін з іх прапануем вашай увазе.

*Падрыхтавала Ніна КАЗЛЕНЯ*

**Леапольд РОДЗЕВІЧ**

## *Буслы*

*У садочку пры дарозе,*
*З часоў даўніх на бярозе*
*Буслы завяліся.*

*Вельмі было дарагое*
*Ім сваё гняздо старое –*
*Навек з ім зжыліся;*

*Але людзі захацелі,*
*Каб то буслы пераселі*
*На другі бок саду;*

*Для таго слуп укапалі,*
*Барану прымацавалі,*
*Розную прыладу.*

*Але буслы больш цанілі*
*Гняздо, што дзяды зрабілі, –*
*На ім засталіся.*

*Лепш, мілей свая руіна,*
*Чымся пекная чужына...*
*Беларус! Свой родны край*
*На чужыя не мяняй!*

Ніна Казленя. З пакалення расстралянай літаратуры